# НавінЫ

БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ»

нумар 12 (45) 3 траўня 2001 г.

# У Менску адбыўся "ЧАРНОБЫЛЬСКІ ШЛЯХ – 2001"




**26 красавіка, у 15-ю гадавіну катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, у Менску адбылася акцыя дэмакратычных сілаў – "Чарнобыльскі шлях". А 17-й гадзіне ўдзельнікі "Шляху" сабраліся на плошчы Свабоды, дзе пачалася ўрачыстая "Гадзіна смутку". Пра ейны пачатак абвесьціла граньне дудара**

У гэты ж час прайшоў жалобны малебен. На плошчы людзі сьпявалі патрыятычныя сьпевы. Амаль кожны ўдзельнік акцыі трымаў запаленую сьвечку ў памяць загінулых ад Чарнобылю. Адной з адметнасьцяў мастацкага аздабленьня акцыі стала спэцыяльная падстаўка для запаленых сьвечак – "Рэхаформ", створаная адмыслова для "Чарнобыльскага шляху" мастаком Генадзем Драздовым. Пасьля заканчэньня гэтай часткі імпрэзы сам мастак і некаторыя ўдзельнікі "Шляху" пусьцілі "Рэхаформ" па Сьвіслачы. Актывісты "Маладога Фронту" правялі некалькі пэрформансаў на тэму Чарнобылю й радыяцыі.

А 18.10 з пл. Свабоды пачалося шэсьце, у якім узялі ўдзел каля 10 000 чалавек. Калёна рушыла па вуліцах Інтэрнацыянальнай, Янкі Купалы і выйшла на праспэкт Ф. Скарыны. Удзельнікі шэсьця, заняўшы цэнтральную паласу праспэкту, скіраваліся да Нацыянальнай акадэміі навук. Там а 19.30 адбыўся кароткі мітынг, на якім выступілі лідэры дэмакратычнага руху.

Адметнасьцю "Шляху" стала поўная адсутнасьць міліцыі на праспэкце Скарыны. Відавочна, гэткім псэўдадэмакратычным крокам улады правакавалі

*Працяг на стар 2.*

vytoki.net

*Пачатак на стар. 1*

# У Менску адбыўся "ЧАРНОБЫЛЬСКІ ШЛЯХ – 2001"




*Падчас акцыі «Чарнобыльскі шлях – 2001» у Менску*

дэманстрантаў скіравацца на пляц Незалежнасьці, па шляху да якога ўжо стаялі падрыхтаваныя штабэлі тратуарнай пліткі. Аднак правакацыі ўдалося пазьбегнуць.

Вінцук Вячорка, старшыня БНФ, так пракамэнтаваў вынікі акцыі: "Гэта найперш чарнобыльская акцыя. Ейная задача, як і самага першага "Чарнобыльскага шляху", – прыцягнуць увагу сьвету да трагедыі, што адбылася 15 год таму, а таксама паказаць, што гэтая трагедыя не хвалюе цяперашнюю ўладу. Праўда, мяркуючы па прапагандовай гістэрыі, што разгарнулі ўрадавыя СМІ напярэдадні акцыі, пад нашым ціскам улады зрабілі выгляд увагі на Чарнобыльскія праблемы. Аднак усім вядома, што з прыходам да ўлады Лукашэнкі былі адмененыя ранейшыя гуманныя дасягненьні дэмакратычных сілаў у гэтай сфэры: спыненае перасяленьне людзей з забруджаных радыяцыяй тэрыторыяў, адмененая забарона вырабу сельскагаспадарчай прадукцыі ў чарнобыльскай зоне. Лукашэнка, ці то з-за жаданьня плянамерна зьнішчаць беларускую нацыю, ці то з-за катастрафічнага развалу эканомікі, скасаваў ранейшыя рашэньні дзеля абароны здароўя нашых людзей... Разам з тым нельга забывацца, што гэты год – год выбараў. Сёньняшняй акцыяй мы паказалі, што людзі пераадольваюць страх. Мы выходзім змагацца за праўду, за будучыню для нашага народу".

Невялікая дэлегацыя, якую склалі пісьменьнік Уладзімер Арлоў, Арына Вячорка, мастак Алесь Цыркуноў, Пятро Русаў, а таксама сябры культурніцкай камісіі БНФ, адправілася на пл. Незалежнасьці, каб ускласьці кветкі да Звана, што ўшаноўвае памяць ахвяраў Чарнобыля, Хіросімы й Нагасакі. "Калі мы за гэтыя цяжкія гады выжылі й ня страцілі сілы духу, то й далей нішто нас не зломіць", – сказаў каля помніку Уладзімер Арлоў.

**Аляксей ШЭІН**

# У рэгіёнах прайшла жалобная акцыя "Чарнобыльскі шлях"

## БАРЫСАЎ

У цэнтры Барысава сабралася каля 150 чалавек, каб ушанаваць ахвяраў Чарнобыльскай катастрофы. Удзельнікі акцыі стаялі ланцужком, трымаючы ў руках сьвечкі.

Міліцыянты затрымалі кіраўніка мясцовай філіі праваабарончага цэнтру "Вясна" Зьміцера Бародку, абшукалі ягоныя рэчы, але празь некаторы час вымушаныя былі адпусьціць.

Перад пачаткам акцыі ў вучэльні будаўнікоў № 62 міліцыя затрымала 16-гадовага хлопца. Яго завезьлі спачатку ў мясцовы РАУС, а потым да яго дахаты. У гэты час дома бацькоў не было. У кватэры міліцыя правяла несанкцыяваны вобыск і знайшла 8 налепак ды некалькі апазыцыйных значкаў. Пасьля гэтага міліцыянты запалохвалі хлопца й "раілі", каб той не хадзіў на чарнобыльскую акцыю.

## ГОМЕЛЬ

200 чалавек сабралася ў Гомелі, нягледзячы на моцны дождж. У памяць ахвяраў Чарнобылю сябры БНФ і іншых дэмакратычных арганізацыяў запалілі сьвечкі й сьпявалі жалобныя песьні.

## МАГІЛЁЎ

26 красавіка Партыя БНФ зладзіла ў Магілёве шэраг акцыяў.

У гэты дзень прайшла прэсавая канфэрэнцыя, прысьвечаная праблемам Чарнобылю, на якую сабраліся мясцовыя журналісты як незалежных выданьняў, так і дзяржаўных. У канфэрэнцыі прымаў удзел прэзыдэнт Дабрачыннага фонду "Дзецям Чарнобылю" Генадзь Грушавы.

Як было заплянавана, прадстаўнікі БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ раздавалі гуманітарную дапамогу дзецям з радыяцыйнага цэнтру, былым ліквідатарам (міліцыянтам), дзецям аднаго зь дзіцячых дамоў гораду. Гуманітарная акцыя, як сьцьвярджае старшыня абласной арганізацыі БНФ Анатоль Фёдараў, будзе яшчэ працягвацца.

Нягледзячы на вялікі дождж, у Магілёве сабралася даволі шмат людзей, каб ушанаваць гадзінай смутку ахвяр Чарнобыльскай катастрофы – каля 500 чалавек.

Анатоля Фёдарава спрабавалі затрымаць як арганізатара акцыі, хаця заяўнікам ён ня быў. Акрамя гэтага, інцыдэнтаў больш не ўзьнікала.

## БЕРАСЬЦЕ

Пасьля замоўленых на 18 гадзінаў малебнаў у каталіцкім касьцёле й уніяцкай царкве, людзі выйшлі на галоўную вуліцу гораду – праспэкт Машэрава. Каля 200 чалавек у накідках, на якіх намаляваны чарнобыльскі знак, сталі з запаленымі сьвечкамі ўздоўж вуліцы. Пазь-

*Працяг на стар. 3*

vytoki.net

Пачатак на стар. 2

# У рэгіёнах прайшла жалобная акцыя "Чарнобыльскі шлях"

ней сябры БНФ і іншых дэмакратычных арганізацыяў Берасьця рушылі па вуліцы й прайшлі да кінатэатру "Беларусь".

Міліцыі было шмат, але яна ня ўмешвалася.

## САЛІГОРСК

У Салігорску плянавалася правесьці «Гадзіну смутку». А 18-й гадзіне у цэнтры гораду сабраліся 20 чалавек. Яны мелі плякаты "Чарнобыль – 15 гадоў", "Абаронім Радзіму разам", раздавалі мінакам бюлетэнь "Права на волю", каляндарыкі "Радыё Свабода".

Неўзабаве пад'ехала міліцыя й разагнала удзельнікаў акцыі. Былі затрыманыя Анатоль Лобан й Сяргей Суліма. На іх складзеныя пратаколы. На А. Лобана – паводле арт. 167. 1, ч.2 КаАП, С. Суліму – арт. 167. 1, ч. 1 КаАП.

## МАЗЫР

Акцыя, прысьвечаная ўгодкам Чарнобыльскай катастрофы, мазырскім заяўнікам не была дазволеная. Аднак заяўнікі не зьмянілі намеру сустрэцца, як было заплянавана раней, і 18 гадзіне на вызначаным месцы. Каля 40 чалавек сабраліся ля чарнобыльскай каплічкі. Тых, хто прыйшоў адзначыць сумную гадавіну, ужо чакалі міліцыянты – прыблізна такая ж колькасьць.




Падчас акцыі «Чарнобыльскі шлях – 2001» у Менску

Удзельнікі акцыі трымалі сьвечкі, моладзь скандавала: "Мы хочам жыць!"
...о ня быў затрыма-

ны, але напрыканцы заяўнікаў акцыі міліцыянты запрасілі "на размову".

## БАРАНАВІЧЫ

На цэнтральнай плошчы гораду а 17 гадзіне сабралося некалькі дзясяткаў чалавек, каб ушанаваць ахвяраў Чарнобыльскай катастрофы. Людзі трымалі плякаты з радыяцыйным знакам, сьвечкі, бел-чырвона-белы крыж. Сябры БНФ раздавалі літаратуру, прысьвечаную ўгодкам трагедыі.

Некаторы час міліцыянты не чапалі ўдзельнікаў акцыі, але праз 40 хвілінаў з боку міліцыі пачалі гучаць пагрозы затрымаць удзельнікаў пікету. Людзі вымушаныя былі спыніць жалобную акцыю.

## СЛОНІМ

Зь 17 гадзінаў у Слоніме праходзіў пікет, які быў прысьвечаны 15-годзьдзю Чарнобыльскай катастрофы. Сабралася каля 10 чалавек, якія трымалі атрыбуты-

ку на чарнобыльскую тэматыку й раздавалі спэцвыпускі газэтаў "Навіны БНФ" і "Рабочы".

## МАЛАДЭЧНА

Каля 300 чалавек сабралася ў Маладэчне 25 красавіка ў Гарадзкім парку,



Падчас акцыі «Чарнобыльскі шлях – 2001» у Менску

каб ушанаваць ахвяраў Чарнобыльскай катастрофы. Дарэчы, гэта была адзіная санкцыянаваная ўладамі акцыя.

На мітынгу вядомыя грамадзкія й палітычныя дзеячы, сярод якіх Іван Нікітчанка, выказвалі свае спачуваньні ахвярам катастрофы й спадзяваньні, што са зьменай улады зьменіцца й становішча людзей, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай катастрофы, а таксама й экалёгія.

Удзельнікамі была ўшанаваная памяць загінуўшых ад Чарнобыльскай катастрофы хвілінай маўчаньня.

Людзі трымалі бел-чырвона-белыя сьцягі, сьцягі Эўразьвязу й Партыі БНФ, якія былі з чорнымі стужкамі. Адзін з удзельнікаў трымаў у руках лёзунг: "За экалёгію лукашэнкаўскай вэртыкалі".

Пасьля людзі накіраваліся да памятнага знаку "Пакутнікам за волю й незалежнасьць Беларусі", дзе ўшанавалі іх запальваньнем сьвечак.

## ГОРАДНЯ

25 красавіка ў Горадні зь 17 да 18 гадзінаў прайшоў малебен у Каложы па ахвярах Чарнобыльскай катастрофы. Пасьля служэньня ўсе людзі рушылі па шляху краеўцаў, якія, нагадаем, 2 гады назад у гэты дзень былі зьбітыя. На тым месцы былі ўскладзеныя кветкі. Увесь шлях удзельнікаў суправаджалі міліцыянты, але ніхто затрыманы ня быў.

**Прэсавая група БНФ**
**"Адраджэньне" й Партыі БНФ**

vytoki.net

# Алесь Бяляцкі: "...Ёсьць усе шанцы перамагчы"

**Назіраньне – неад'емная частка любых дэмакратычных выбараў. Назіральнікі перашкаджаюць усемагчымым фальсыфікацыям ды парушэньням і тым самым абараняюць волевыяўленьне грамадзянаў. Падрыхтоўка назіральнікаў прэзыдэнцкія выбары ўжо распачалася. У гэтым кірунку працуе некалькі грамадзкіх арганізацыяў ува ўсёй краіне. Найбольш актыўная дзейнасьць, да якой сёньня ўжо далучыліся каля 200 няўрадавых арганізацыяў, вядзецца пад эгідай Асамблеі дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў. Аб гэтай працы мы папрасілі распавесьці старшыню Асамблеі, намесьніка старшыні БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ Алеся Бяляцкага.**



*Алесь Бяляцкі*

– Як паказвае практыка, і гэта нечакана для нас, роля назіральнікаў у выбарчых кампаніях даволі вялікая. Мы доўга ламалі галаву: з чым зьвязаная нэрвовая рэакцыя ўладаў на працу назіральнікаў, якая была намі арганізавана падчас восеньскіх выбараў у "палату"? Чым выкліканая неадэкватная рэакцыя ўладаў на назіраньне, якое, у прынцыпе, было заўсёды – і на выбарах у 1994, 1995, 1997 гг.? Сыстэма назіраньня, якая працуе сёньня, больш арганізаваная, чым папярэднія, бо мы адчуваем, што гэтыя выбары й іх вынікі надзвычай важныя для лёсу краіны, і неабходна, каб яны былі сапраўдныя, не былі сфальсыфікаваныя.

На сьнежаньскай Асамблеі была выпрацаваная канцэпцыя назіраньня для будучых прэзыдэнцкіх выбараў. Паводле яе, да працы па падрыхтоўцы назіральнікаў плянавалася далучыць некалькі дзясяткаў НА. Атрымалася, што



далучылася некалькі сотняў арганізацыяў, якія стварылі грамадзкую ініцыятыву па назіраньні за выбарамі "Незалежны погляд". На сёньня «Незалежны погляд" аб'ядноўвае больш за дзьвесьце вельмі розных арганізацыяў. Усю працу па навучаньні каардынуе Асамблея няўрадавых арганізацыяў.

Перад намі сёньня стаяць тры асноўных задачы назіраньня: першая – гэта не дапусьціць фальсыфікацыі падчас самога галасаваньня. Дзеля гэтага назіральнікі будуць прысутнічаць на ўчастках, адсочваць увесь працэс, уносіць заўвагі, калі бачаць нейкія парушэньні, прысутнічаць падчас складаньня канчатковага пратаколу, выпісваць зь яго зьвесткі. Назіральнікі маюць права на гэта згодна з заканадаўствам аб выбарах – кола правоў можа быць і ня вельмі вялікае, але юрыдычна замацаванае, зь якім мы можам канкрэтна працаваць.

Другі момант – інфармацыйны. Нашая зvytoki.net першую чаргу беларускаму грамадзтву, а таксама й міжнароднай супольнасьці сапраўдныя вынікі галасаваньня, інфармацыю, якую мы атрымаем праз працу назіральнікаў.

Мне здаецца, што менавіта гэтыя два моманты страшэнна не падабаюцца ўладам, таму што асноўная стаўка перамогі на выбарах, як бачыць гэта Лукашэнка, базуецца якраз на фальсыфікацыі. Апошні прыклад – паўторныя выбары ў "палату" 18 сакавіка. Паводзіны камісіяў падчас выбараў паказваюць, што яны гатовыя ісьці на любое парушэньне закону дзеля таго, каб дабіцца патрэбных вынікаў.

Трэцяе – гэта пераканаць людзей, што іхныя галасы не прападуць дарэмна. Яны прыдуць, прагаласуюць, і нават калі афіцыйныя камісіі ім ня скажуць праўду, то мы ім усё роўна скажам, можа быць, нават раней за афіцыйныя камісіі. Усе даведаюцца сапраўдны вынік галасаваньня, а гэта значыць – ісьці трэба. Ня трэба сядзець дома, махаць рукой – "усё роўна падтасуюць, напішуць тое, што трэба". Не! Мы зробім усё, каб давесьці праўду пра вынікі галасаваньня.

**– Якія парушэньні фактычна могуць папярэдзіць назіральнікі падчас самых выбараў?**

– Хутчэй за ўсё, парушэньні, як мы бачым, будуць рабіцца ў наступных этапах: першае – гэта папярэдняе галасаваньне – наагул самае непрыемнае, што ёсьць у гэтых выбарах. Магчымасьць для парушэньняў тут вельмі вялікая, таму што на працягу 5 дзён скрыні фактычна не ахоўваюцца. Мы ў гэтай сытуацыі мусім забясьпечыць хоць нейкі кантроль за імі.

Па-другое, часта пасьля заканчэньня субтыкаліся з такой зьявай, як перапісваньне пратаколаў. Калі вынікі выбараў незадавальняюць прадстаўнікоў улады, то яны проста перапісваюць пратаколы, беручы лічбы са столі. Мы ведаем пра гэтыя небясьпечныя моманты і будзем зьвяртаць увагу перадусім на іх.

**– У Сэрбіі назіральнікі вялі паралельны падлік галасоў і дзякуючы гэтаму яны даведаліся пра вынікі галасаваньня раней за выбарчыя камісіі. Ці будзе весьціся такая праца ў нас?**

– Паралельны падлік мы будзем абавязкова весьці. У Сэрбіі гэта мела прынцыповае значэньне, бо там ёсьць акругі, у якіх фактычна не было выбаршчыкаў, як тое ж Касова, напрыклад. А дзясяткі тысячаў бюлетэняў у такіх акругах аказаліся запоўненымі за Мілошавіча. Такім чынам, паралельны падлік там меў яшчэ большы сэнс, бо калі на ўчастак прыходзіла тры чалавекі – у скрынях аказвалася тысяча бюлетэняў... Вось табе й вынікі.

Іншая справа, што пры падліку галасоў неабходна прадухіліць перапісваньне пратаколаў, калі на ўчастку складаецца адзін пратакол, а ў раён трапляе зусім іншы, зь іншымі лічбамі, падпісаны старшынём, ці сябрам, ці сакратаром камісіі. Вось тут нашая задача сказаць: "Не, выбачайце. Быў зусім іншы дакумэнт, і былі іншыя лічбы, іншая сытуацыя". І мы спадзяемся, што нашая гатоўнасьць да такіх рэчаў перасьцеражэ ўлады перад абсалютна бессаромнымі фальсыфікацыямі. Ад гэтага ж фактычна залежыць легітымнасьць будучага прэзыдэнта, – ці хоча ён быць агульнапрызнаным прэзыдэнтам, ці ён пагодзіцца з тым, што яго будуць называць махляром і самазванцам.

Мы будзем весьці паралельны падлік, але асноўную мэту працы усё ж такі бачым у тым, каб адсачыць падлік галасоў пасьля заканчэньня самых выбараў. Гэта значыць, што калі, напрыклад, на ўчастку прагаласавала тысяча чалавек – 500 за аднаго кандыдата і 500 за іншага, то такія лічбы павінны заставацца й у пратаколах, так гэтыя вынікі павінныя пайсьці ў раённую, абласную, а потым у Цэнтральную выбарчую камісію. Лічбы не павінны зьмяншацца ці павялічвацца ў той ці іншы бок, і нашая справа – сачыць за гэтым.

Калі казаць пра Сэрбію, то трэба адзначыць, што назіраньне там было арганізавана вельмі добра. Сябры шматлікіх палітычных партыяў бралі ўдзел у выбарчых камісіях – магчымасьць, якой у нас зараз амаль няма і гэта вялікая праблема, бо нашыя камісіі фактычна кантралююцца выканкамамі, выканаўчай уладай. Умовы для назіраньня ў Сэрбіі былі лепшыя, чым нашы.

**Падрыхтавала М. САВУШКІНА**

***(далей будзе)***

# УЛАСНАСЬЦЬ



Іван САВЕРЧАНКА

**Аптымальныя прапорцыі формаў і тыпаў уласнасьці ў краіне – адна з найважнейшых перадумоваў устойлівага разьвіцьця нацыянальнай гаспадаркі. Перакосы, крайнасьці й неадрэгуляванасьць пытаньняў уласнасьці непазьбежна прыводзяць да заняпаду й разбурэньня эканомікі, што мы сёньня выразна назіраем у нашай краіне. Якую стратэгію належыць абраць і якія першачарговыя крокі належыць неадкладна зрабіць у сфэры ўласнасьці, каб кардынальна палепшыць фінансавае становішча суб'ектаў гаспадараньня краіны ў цэлым?**

## Цывілізацыйны стандарт

Катэгорыя "ўласнасьці" уключае два складнікі – "сродкі вытворчасьці" й "нерухомасьць". На цяперашні момант у Беларусі звыш 80% сродкаў вытворчасьці й нерухомасьці знаходзіцца ва ўласнасьці дзяржавы, што наўпрост уплывае на структурныя парамэтры. У залежнасьці ад формы ўласнасьці структура занятасьці насельніцтва Беларусі, паводле статыстыкі, на прадпрыемствах разьмяркоўваецца прыкладна наступным чынам: дзяржсэктар – 59,9 %; калгасы – 12,4 %; спажыўкааперацыя – 2,9 %; арэндныя прадпрыемствы – 5,7 %; акцыянэрныя прадпрыемствы – 6,1 %; мяшаная й замежная ўласнасьць – 1,1 %; індывідуальнае й прыватнае прадпрымальніцтва – 7,8 %; іншыя формы недзяржаўных прадпрыемстваў – 4,1 %. Існуючыя ў нашай краіне прапорцыі – вельмі далёкія ад аптымальных.

Актуальнасьць і аб'ектыўная эканамічная неабходнасьць пашырэньня недзяржаўнага сэктару эканомікі – акцыянаваньня й прыватызацыі – палягае ў наступным:

1. Гаспадарка краіны, якая складаецца з сотняў тысячаў прыватнаўласьніцкіх гаспадарак – найбольш устойлівая й найбольш мабільная.

2. Канцэнтрацыя значнай долі сродкаў вытворчасьці ў прыватных асобаў, аўтаномных калектываў – адзін з вызначальных чыньнікаў стабільнасьці, моцы й бясьпекі краіны ды й грамадзтва ў цэлым.

3. Устойлівай заканамернасьцю можна лічыць тое, што знаходжаньне сродкаў вытворчасьці ў прыватных руках – найвялікшы стымул у дзейнасьці чалавека, фактар максымальнай актывізацыі яг[illegible] энэргіі, бо з атрыманьнем уласнасьці зьяўляецца рэальная магчымасьць адказнага вытворчага кіраваньня, прыняцьця стратэгічных рашэньняў. Эфэктыўнасьць працы, рэнтабэльнасьць на прадпрыемствах недзяржаўнай формы ўласнасьці, як правіла, вышэйшыя, чымся на дзяржаўных.

4. Прадпрыемствы зь недзяржаўнай формай уласнасьці найбольш прывабныя як аб'ект для разьмяшчэньня прыватнага капіталу. Для вонкавага інвэстара тып уласнасьці – адзін з найважнейшых крытэраў прыняцьця пазытыўнага рашэньня.

5. Разьвіцьцё недзяржаўнага сэктару эканомікі – падмурак станаўленьня канкурэнцыі й адкрытасьці рынку, што стварае найлепшыя ўмовы для абароны спажыўцоў.

Такім чынам, у нашай краіне відавочна існуе агульнаэканамічная патрэба пераўтварэньня дзяржаўных і арэндных прадпрыемстваў у акцыянэрныя й прыватныя. У Беларусі ёсьць шырокае поле для разьвіцьця малога й сярэдняга бізнэсу, стварэньня ўмоваў для прыцягненьня капіталу, перадусім, у прыватны сэктар.




## Сродкі вытворчасьці

Ключавая праблема зьмены формаў уласнасьці ў сфэры сродкаў вытворчасьці – пошук аптымальных, эфэктыўных мэханізмаў. Наўпроставае акцыянаваньне звыш 1200 дзяржпрадпрыемстваў, з уключэньнем імянных прыватызацыйных чэкаў "Маёмасьць" (з правам абмену на іх да 50% акцыяў, што пераходзяць да дзяржавы) – не дало й не магло даць станоўчых вынікаў. Па-першае, у акцыянэрныя таварыствы ператвораныя каля 700 прадпрыемстваў. Насельніцтва, аднак, мела магчымасьць праз "Ашчадны банк "Беларусбанк" набываць за чэкі "Маёмасьць" акцыі толькі 226 прадпрыемстваў, а астатнія, найбольш прыбытковыя, дзеля карумпаванага нутранога падзелу, заставаліся недаступнымі для людзей. Па-другое, самае галоўнае – не былі адрэгуляваныя пытаньні крыніцаў фінансаваньня акцыянаваньня й прыватызацыі, што дазволіла набываць дзяржпрадпрыемствы за кошт крэдытаў, узятых у той жа дзяржавы. Відавочна, што з часам характар прыватызаваных такім чынам прадпрыемстваў давядзецца пераглядаць. Істотны недахоп палягаў у сфэры канцэптуальных недапрацовак, ужываньні некарэктных мэтодык і мэханізмаў акцыянаваньня, пры якіх не ўлічваліся ключавыя сыстэмныя элемэнты.

Аптымальная схема, базавая мадэль разьдзяржаўленьня мусіць уключаць, паводле нашага меркаваньня, тры абавязковыя кампанэнты:

разьдзяржаўленьне праводзіцца пры ўдзеле адмыслова вызначанай, ведамай сваімі папярэднімі станоўчымі вынікамі кансальтынгавай групы, спэцыялісты якой прафэсійна падрыхтаваныя для ажыцьцяўленьня падобных апэрацыяў;

наяўнасьць з боку ініцыятараў і кансультантаў цьвёрдых гарантыяў паступленьня фінансавых рэсурсаў, інвэстыцыяў у рэфармаванае прадпрыемства, з мэтай імклівага структурнага й тэхналягічнага пераўтварэньня;

прапрацаванасьць і вырашанасьць пытаньня аб рынках рэалізацыі прадукцыі новай якасьці, атрыманай у выніку пераўтварэньняў прадпрыемства.

Належыць выкарыстоўваць тры асноўныя спосабы прыватызацыі, якія засьведчылі сваю эфэктыўнасьць у іншых краінах.

Першы. Продаж аб'ектаў дзяржаўнай уласнасьці на аўкцыёне (з умовамі або бязь іх), праз конкурс. Парадак іх правядзеньня рэгулюецца агульнай для ўсіх удзельнікаў конкурсу інструкцыяй. Продаж дзяржаўнай уласнасьці на конкурсах і аўкцыёнах ажыцьцяўляецца толькі за грошы.

Другі. Продаж акцыяў, што належаць дзяржаве, у тым ліку на льготных умовах. Ажыцьцяўляе нацыянальны орган па кіраваньні дзяржаўнай маёмасьцю або мясцовыя выканаўчыя ўла-

Працяг на стар. 7

vytoki.net

# Грамадзкія стасункі й стасункі з грамадзкасьцю

## Грамадзкія стасункі

Яны характарызуюць узаемазалежнасьць сацыяльных групаў, клясаў, нацыяў у адзіным грамадзкім арганізме, а таксама сувязі ўнутры кожнай з структурных групаў соцыюму, якія складваюцца ў працэсе жыцьцядзейнасьці людзей.

Супрацоўніцтва людзей у іх стасунках з прыродай, адзін з адным, грамадзтвам не выключаюць антаганізму, канфліктаў, супярэчнасьцяў інтарэсаў, сацыяльных адрозьненьняў. Супрацоўніцтва супрацьстаіць дысгарманічным стасункам, больш за тое – толькі на глебе супрацоўніцтва і магчыма пераадолець войны, рэвалюцыі, дзяржаўныя перавароты.

Структура грамадзкіх стасункаў улучае матэрыяльны, ідэалягічны, сацыяльна-псыхалягічны аспэкты. У якасьці падсыстэмаў гэтае структуры можна разглядаць палітычныя, а таксама эканамічныя стасункі ў грамадзтве.

Грамадзкая думка функцыянуе ва ўсіх структурах грамадзтва. Як стан масавай сьвядомасьці, што выяўляе стаўленьне сацыяльных групаў да праблемаў сумеснага існаваньня, грамадзкая думка падтрымлівае (або адхіляе) нормы, каштоўнасьці, меркаваньні ці ацэнкі "уладароў думак" публікі.

PR у якасьці структурнага аспэкту грамадзкіх стасункаў шчыльна зьвязаны з асаблівасьцямі фармаваньня й функцыянаваньня грамадзкай думкі, мэханізмам паблісыты, г.зн. з прыёмамі стварэньня папулярнасьці, прыцягальнасьці пэўным асобам у зьвязку зь іхнай дзей-

*Працяг на стар. 8*



# УЛАСНАСЬЦЬ

*Пачатак на стар. 6*

ды. Прыярытэт маюць сябры працоўнага калектыву, для якіх існуе скідка, па цане на 20% ніжэйшай за намінальны кошт.

Трэці. Выкуп арэндным прадпрыемствам маёмасьці дзяржаўнага прадпрыемства, здадзенага ў арэнду. Да 50% кошту маёмасьці, што выкупляецца, можа аплочвацца іменнымі прыватызацыйнымі чэкамі "Маёмасьць".

Пры пераўтварэньні дзяржаўнага прадпрыемства ў акцыянэрнае таварыства ўзьнікае шэраг праблемаў, у прыватнасьці, выяўленьне аптымальнага прынцыпу разьмеркаваньня акцыяў. Слабое месца акцыянаваньня таксама ў тым, што кантрольны пакет акцыяў, застаючыся ў руках дзяржавы, дае ёй магчымасьць дыктаваць сваю волю акцыянэрам. Заўсёды ёсьць небясьпека й з другога боку: нанятыя кіраўнікі акцыянэрнага таварыства, канцэнтруючы ў сваіх руках кантрольны пакет акцыяў, могуць злоўжываць сваёй уладай і адвольна разьмяркоўваць атрыманыя дывідэнды. Патрабуе тэарэтычнага разьвязаньня праблема кіраваньня акцыянэрным таварыствам, бо яно на сучасны момант зьяўляецца найбольш складаным у параўнаньні з усімі іншымі вядомымі тыпамі прадпрымальніцкіх аб'яднаньняў.

Разьдзяржаўленьне, аднак, не азначае, што зьнікае праблема эфэктыўнага кіраваньня дзяржмаёмасьцю – прадпрыемствамі й нерухомасьцю, што застаюцца дзяржаўнай уласнасьцю.

Варта ўлічваць, што ў залежнасьці ад абставінаў нацыяналізаваная (дзяржаўная) гаспадарка, зь ейнай галоўнай уласьцівасьцю – знаходжаньнем сродкаў вытворчасьці ў агульнанароднай уласнасьці, якая кіруецца ўрадам, можа мець пэўныя перавагі. Прыкладам, у тых сфэрах, якія патрабуюць велізарных і рэгулярных капіталаўкладаньняў – чыгунка, энэргетыка. У часе ўзьнікненьня пагрозы стратэгічным інтарэсам краіны, таксама лягічна павелічэньне нацыяналізаванага сэктару эканомікі.

## Інтэлект і інфармацыя

У рэчышчы агульнасусьветных тэндэнцыяў надзвычай важна ажыцьцявіць істотныя карэгаваньні ў галіне інтэлектуальнай і інфармацыйнай уласнасьці. Прыярытэтнымі тут на цяперашні момант зьяўляюцца шэсьць напрамкаў.

1. Усьведамленьне ў грамадзтве каштоўнасьці аб'ектаў інтэлектуальна-інфармацыйнай уласнасьці, улік і ацэнка іх у складзе нематэрыяльных актываў на прадпрыемствах і навуковых арганізацыях. Правядзеньне экспэртнай ацэнкі ў адпаведнасьці з стандартамі "TIA VSC" Міжнароднага камітэту па стандартах ацэнкі маёмасьці, досьведу Амэрыканскага таварыства ацэншчыкаў, напрацовак нацыянальнага Белдзяржпатэнту.

2. Разьвіцьцё сыстэмы інстытутаў дзяржаўнай навукова-тэхнічнай інфармацыі. Ахова правоў інтэлектуальнай уласнасьці.

3. Разьвіцьцё ліцэнзійнага гандлю інтэлектуальным прадуктам. Асноўная ўмова – далучэньне Беларусі да пагадненьня аб гандлі інтэлектуальнай уласнасьцю – TRIPS (Trade-related Aspects of Intellectual Property Rights), якое ахоплівае аўтарскія й сумежныя правы, таварныя знакі, найменьне месцаў паходжаньня тавараў, прамысловыя ўзоры, патэнты, тапалёгіі інтэгральных схемаў.

4. Удасканаленьне сыстэмы аўтарскага права й сумежных правоў.

5. Разьвіцьцё інавацыйнай сфэры.

6. Стварэньне інфраструктуры дзеля забесьпячэньня трансфэрту тэхналёгіяў: адкрыцьцё тэхнапаркаў, тэхналягічных інкубатараў, інавацыйных цэнтраў, інавацыйна-вэнчурных фондаў.

## Зямля як від нерухомасьці

Увядзеньне інстытуту прыватнай уласнасьці на зямлю, разьвіцьцё рынку зямлі, іх прававое замацаваньне – найгалоўнейшы крок вяртаньня Беларусі на магістральны шлях цывілізаванага разьвіцьця грамадзтва. Адна з мэтаў пераўтварэньняў – стварэньне шматуклады нага аграсэктару з рознымі формамі ўласнасьці.

Ключавы накірунак – перафармаваньне калектыўных гаспадарак, а не парцэляцыя землекарыстаньня. На сучасным этапе, аднак, неабходна павялічыць максымальны памер падсобных гаспадарак да 5 га.

У аснову пераўтварэньняў формаў уласнасьці на зямлю найбольш мэтазгодна пакласьці іпатэчны мэханізм. Галоўны ягоны інстытуцыянальны элемэнт – Зямельны банк.

Пры вызначэньні мэханізмаў і ўмоваў перадачы зямлі сялянам у прыватную ўласнасьць важна прадугледзіць шэраг супрацьвагаў, выкананьня шэрагу ўмоваў па апрацоўцы зямлі.

***

Разьвязаньне пытаньня аб аптымальнай структуры грамадзкай уласнасьці варта зьвязваць у першую чаргу з эфэктыўнасьцю, пошукам шляхоў павелічэньня нацыянальных багацьцяў. Сам па сабе тып уласнасьці ня можа быць самамэтай. Зь іншага боку, на жаль, не выведзены закон, няма тэарэмы, паводле якой можна для кожнай канкрэтнай краіны, або рэгіёну, закласьці аптымальныя прапорцыі паміж дзяржсэктарам, калектыўнай уласнасьцю, прыватнай, а таксама з удзелам замежнага капіталу, якія могуць даваць найбольшы эфэкт ня толькі адразу, але, што істотна – у доўгатэрміновай эканамічнай і сацыяльнай пэрспэктыве. Па ўсім відаць, гэта занадта складаная задача, каб вырашыць яе толькі матэматычна-статыстычнымі мэтодыкамі. У гэтай сфэры, мусіць, найбольш прыдатная для ўлады формула – няспынны пошук аптымальнага варыянту, энэргічныя экспэрымэнтаваньні, але на адносна нязначных сэктарах.

vytoki.net

*Пачатак на стар 7.*

# Грамадзкія стасункі й стасункі з грамадзкасьцю

насьцю – грамадзка-палітычнай, вытворчай, камэрцыйнай і г.д. Пры гэтым PR-спэцыялісты арыентуюцца на ўзгадненьне інтарэсаў асабістых, групавых – зь інтарэсамі грамадзкімі. Пасьпяховае вырашэньне гэтай прафэсійнай задачы ў кожным канкрэтным выпадку дае магчымасьць кіраваць стасункамі людзей, ствараць умовы для гарманізацыі грамадзкіх стасункаў.

Сацыяльныя інстытуты ёсьць носьбітамі грамадзкіх стасункаў (разам з тымі людзьмі, якія працуюць у іх – чыноўнікамі дзяржаўных установаў, апаратам палітычных партыяў і грамадзкіх рухаў, рэдакцыйнымі супрацоўнікамі газэтаў, служачымі й працаўнікамі фірмаў, карпарацыяў і аб'яднаньняў). У гэтай сыстэме сацыяльных інстытутаў сфэра PR рэпрэзэнтаваная PR-агенцтвамі, PR-фірмамі, кансультацыйнымі фірмамі, прэсавымі цэнтрамі, службамі, бюро, службамі па сувязях з грамадзкасьцю й г.д. Праца PR-інстытутаў можа лічыцца пасьпяховай, калі створаныя імі ўзоры іміджу, прыёмы падтрыманьня рэпутацыі, спосабы стварэньня паблісыты ня будуць адхіленыя сыстэмай грамадзкіх стасункаў, якая іх атачае.

Інфармацыйны прадукт PR-агенцтва (PR-фірмы, прэсавага цэнтру) у выглядзе іміджу, рэпутацыі, паблісыты, кансультацыі элястычна ўлучаецца ў сыстэму грамадзкіх стасункаў, у дзейнасьць сацыяльных інстытутаў. Уласна, на глебе існуючых стасункаў, а таксама ўзаемасувязі грамадзкіх інстытутаў і магчымае дасягненьн мэтаў PR. Імідж зразумелы й эфэктыўны, калі ён адпавядае чаканьням, патрэбам і густам публікі, г.зн. тым стасункам, якія настолькі звыклыя для аўдыторыі, што сталіся стылем жыцьця.



## Палітычныя стасункі

Палітычныя стасункі – гэта канкрэтныя праявы ўлады ў грамадзтве, сувязь улады з усімі ейнымі структурнымі падразьдзяленьнямі, з усімі сацыяльнымі інстытутамі. Гэта – уладныя стасункі, суб'ектамі якіх ёсьць палітычныя партыі й рухі, дзяржава (у адзінстве трох галінаў улады – заканадаўчай, выканаўчай і судовай).

Сфэра палітычных стасункаў зьвязаная з палітычнай сьвядомасьцю індывідаў, групаў, клясаў, супольнасьцяў. Намаганьнямі прафэсійных палітыкаў (лідэраў), ідэолягаў ствараюцца канкрэтныя формы палітычнай сьвядомасьці – ідэі, вучэньні, канцэпцыі, дактрыны (на тэарэтычным роўні), праграмы, статуты, заявы ў зьвязку з канкрэтнымі сацыяльнымі праблемамі й г.д. (на эмпірычным роўні).

Палітычныя паводзіны людзей і сацыяльных групаў разьвіваюцца ў сфэры барацьбы за ўладу, а таксама ажыцьцяўленьня ўлады (выбары, рэформы, функцыянаваньне кіраўнічага апарату, рэвалюцыі й контрарэвалюцыі й г.д.). Прымаючы ўдзел у гэтых і іншых мерапрыемствах, чалавек праходзіць школу палітычнай сацыялізацыі (ейныя асновы закладаюць сям'я, школа, лідэры думак; замацоўваецца сацыялізацыя палітычнымі арганізацыямі, палітычнай прапагандай, палітычнай ідэалёгіяй).

**Падрыхтаваў Сяргей Кандратовіч**

*(далей будзе)*

Сваю заяву на ўступленьне ў Партыю БНФ Вы можаце дасылаць на адрас:
**220005, г. Менск, вул. Варвашэні, 8, Управа Сойму Партыі БНФ**

**Ва Ўправу Сойму Партыі БНФ Грамадзяніна Беларусі**

______________________________
(прозьвішча)
______________________________
(імя)
______________________________
(імя па бацьку)

**якія нарадзіўся «___» ______________ 19__**
**жыве па адрасе:** ______________________
(індэкс і поўны адрас)
______________________________
______________________________
**род заняткаў:** ______________________
**тэл.** ______________________

**ЗАЯВА**

**Прашу прыняць мяне ў Партыю БНФ. Праграмныя палажэньні БНФ «Адраджэньне» падзяляю. Абавязуюся выконваць Статут Партыі БНФ.**

______________ (дата) ______________ (подпіс)

НавінЫ
Б Н Ф «АДРАДЖЭНЬНЕ»
№ 12 (45), 3 траўня 2001 г., наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна на правах нут-

Адрас для ліставаньня: 220005, Менск, а/с 42, тэл. 284-50-12
E-mail: bnf@journalist.com
в.а. рэдактара Віктар Івашкевіч
рэдактар нумару Аляксей Шэін

У нумары выкарыстаныя фатаздымкі Irex/ProMedia

vytoki.net